

# «ДАВАЙЦЕ ВЯРТАЦЦА ДА РЭАЛІЙ СЁННЯШНЯГА ДНЯ І РАЗУМЕЦЬ, ЧАГО ГЭТА КАШТУЕ»

**Ад чыгункі да школьнага харчавання: акцэнты нарады Прэзідэнта з кіраўніцтвам Саўміна**

(Стар. 2–4)

РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 КАСТРЫЧНІКА 2025 г. ПЯТНІЦА № 206 (30594)

# КУРС НА БЯСПЕКУ

**Аб першых выніках укаранення новых палажэнняў Правілаў дарожнага руху расказалі ў ДАІ**



З 1 верасня ў Беларусі дзейнічаюць абноўленыя Правілы дарожнага руху, якія змянілі статус веласіпедыстаў і карыстальнікаў самакатаў. Першыя даныя паказваюць: аварыйнасць з іх удзелам скарацілася ўдвая. Як новыя нормы прыжываюцца на практыцы, даведалася карэспандэнт «Звязды».

СТАР. 10

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.



КУДЫ НАКІРУЮЦЬ ГРОШЫ, ЗАРОБЛЕНЫЯ НА СУБОТНІКУ? 4




ЧЫМ УНІКАЛЬНЫ ПРАЕКТ «100 ІДЭЙ ДЛЯ БЕЛАРУСІ» 8–9




**+TV ПРАГРАМА**

«ЗАКОННЫ ШЛЮБ»

# НАБОР І ПРАЦАЎЛАДКАВАННЕ — 100 ПРАЦЭНТАЎ

**Як рыхтуюць спецыялістаў у Гродзенскім дзяржаўным электратэхнічным каледжы імя Івана Шчаснага**

Летась каледж адзначыў сваё 85-годдзе. Шмат выпускнікоў пакінулі яго сцены і пабудавалі паспяховыя кар'еры. Мы адправіліся на месца падзей, каб на свае вочы паглядзець, як праходзіць адукацыйны працэс.

СТАР. 8–9



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

TikTok

ISSN 1990 — 763X

25206>

9 771990 763008

# «ДАВАЙЦЕ ВЯРТАЦЦА І РАЗУМЕЦЬ,

## Ад чыгункі да школьнага харчавання:

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сабраў у Палацы Незалежнасці нараду з кіраўніцтвам Савета Міністраў. Ніякай надзвычайшчыны — мерапрыемства рабочае, прысвечанае разгляду важных для людзей пытанняў. «Перад тым, як прымаць найважнейшыя рашэнні або рашэнні, якія выклікаюць асаблівае гучанне ў нашым грамадстве, мы сустракаемся, каб параіцца. Ну, і для мяне важна, прымаючы рашэнні, атрымаць дадатковую інфармацыю ад ініцыятараў тых ці іншых пытанняў», — удакладніў Аляксандр Лукашэнка, чым абумоўлена мерапрыемства. На парадку дня гэтай нарады — некалькі надзённых пытанняў.



**Першае.**

### ДАЛЕЙШАЕ РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ЧЫГУНКІ

«Бясспрэчна, што чыгунка — найважнейшае прадпрыемства не толькі для транспартнай галіны, але і для ўсёй краіны. Чыгуначным транспартам штогод перавозяцца дзясяткі мільёнаў тон грузаў. Гэта і сыравіна, і імпарт, і экспартныя пастаўкі нашай прадукцыі. Для людзей — самы танны і бяспечны спосаб перамяшчэння. І хоць пасажырскія перавозкі — хутчэй сацыяльны, а не камерцыйны кірунак вашай работы, развіваць трэба абодва, — звярнуўся да прысутных на нарадзе кіраўнік дзяржавы. — Так, з-за санкцый (і сітуацыі ва Украіне, дзе некалькі нашых таварных саставаў літаральна па-піраццу, іншага слова не падбяру, захоплены і ўтрымліваюцца на яе тэрыторыі або ў сумежных заходніх дзяржавах) нашы грузапатокі прыйшлося кардынальна трансфармаваць, шукаць новую лагістыку і ў цэлым мабілізавацца. Бо даходы праселі». Кіраўнік дзяржавы прызнаўся: яго здзіўляе чарговая канстатацыя таго, што дзесьці захапілі чыгуначныя саставы. Ён папрасіў далажыць, што зроблена для таго, каб іх вярнуць.

Паводле слоў Прэзідэнта, хоць у цэлым перавозачная дзейнасць БЧ засталася прыбытковай, фінансавае становішча прадпрыемства абцяжарваюць высокія выдаткі па абслугоўванні крэдытаў, прыцягнутых пад інфраструктурныя праекты і закупку новага рухомага саставу.

Каб стабілізаваць сітуацыю, падрыхтаваны праект распараджэння аб дзяржаўнай падтрымцы Беларускай чыгункі. Кіраўнік дзяржавы заўважыў: на першы погляд, трэба дапамагчы. Але заклікаў разабрацца. «У якой частцы мы будзем аказваць (калі будзем) гэтую дапамогу?

**Наогул, чарговы раз публічна вас папярэджваю: перастаньце хадзіць сюды па грошы! Спыніцеся. Ёсць працоўныя калектывы, ёсць кампетэнцыі. У дадзеным выпадку ёсць цягнікі, аўтамабілі, самалёты, верталёты і іншае. Лётайце і перамяшчайцеся», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён удакладніў: праблемы сапраўды абумоўлены знешнімі фактарамі (якіх, як нагадаў кіраўнік дзяржавы, няма і быць не можа) ці гэта недапрацоўкі і нядбалае стаўленне да сваіх абавязкаў кіраўніцтва галіны і Беларускай чыгункі? «Можа, гэта самыя бедныя нашы людзі? Беднейшыя, чым у сельскай гаспадарцы або ў Віцебскай вобласці? Усе кажуць: «Не». Тады чаго вы да мяне прыйшлі?» — заўважыў беларускі лідар. Таксама, паводле яго слоў, трэба разумець, якія меры па вырашэнні праблем ужо прыняты ўрадам і які ад іх эфект.

**Даслоўна**

### МАГІСТРЫ ПАД ПАТРЭБЫ ЭКАНОМІКІ І ЯКАСНАЕ ХАРЧАВАННЕ ШКОЛЬНІКАЎ



Як адзначыў у размове з журналістамі **міністр адукацыі Андрэй Іванец,** кіраўнік дзяржавы сарыентаваў на тое, што падрыхтоўка кадраў на ўсіх ступенях павінна ажыццяўляцца выключна ў інтарэсах нашай краіны і нацыянальнай эканомікі. «Беларуская адукацыя мае высокі імідж не толькі ўнутры краіны, але і за яе межамі, — канстатаваў міністр. — Якасць нашай адукацыі вядомая, і аб гэтым сведчыць тая колькасць замежных грамадзян, якія навучаюцца ў нашых ВНУ. Магістратура не з'яўляецца выключэннем».

Кіраўнік ведамства праінфармаваў, што ў магістратуры ў Беларусі на бягучы момант навучаецца каля 10 тысяч чалавек, з іх 6 тысяч — замежныя грамадзяне, што сведчыць аб прывабнасці гэтай формы навучання. «Прэзідэнт яшчэ раз падкрэсліў, што тыя штучныя бар'еры, якія створаны для адораных, таленавітых хлопцаў і дзяўчат, павінны быць ліквідаваны, — удакладніў Андрэй Іванец. — Маладыя людзі, якія зацікаўлены займацца навуковай, навукова-даследчай дзейнасцю, павінны мець магчымасць прыходзіць у аспірантуру без заканчэння магістратуры. Кожны ўніверсітэт і вучоныя саветы павінны бачыць такіх хлопцаў і дзяўчат і выдаваць адпаведныя рэкамендацыі».

Тыя выпускнікі, якія пасля заканчэння ўніверсітэта хочуць займацца выкладчыцкай дзейнасцю, па словах міністра, таксама неабавязкова павінны заканчваць магістратуру.

«Кіраўнік дзяржавы заклікаў яшчэ раз сур'ёзна і ўзважана падысці да таго, каго мы рыхтуем, па якіх праграмах, але, самае галоўнае, гэта павінна адпавядаць інтарэсам нашай краіны і нашага грамадства, — акцэнтаваў увагу міністр адукацыі. — Магістратура з'яўляецца паглыбленай, павышанай адукацыяй. І ў гэтай сувязі калі прадпрыемствам, якое адкрывае новыя вытворчасці, укараняюцца новыя тэхналогіі, навуковым арганізацыям або ўстановам адукацыі патрэбны такія спецыялісты, то гэтыя арганізацыі павінны рабіць мэтавы заказ. Адпаведна, кожны заказчык кадраў бярэ на сябе абавязацельствы і на гады наперад гарантуе далейшае працаўладкаванне такіх спецыялістаў. Такім чынам, і адказнасць заказчыкаў, і адказнасць ВНУ размеркавана. Задача ВНУ — падрыхтаваць высокакваліфікаванага спецыяліста. Задача заказчыка кадраў — забяспечыць гэтага спецыяліста працоўным месцам».

Для замежных грамадзян падрыхтоўка ў магістратуры па-ранейшаму будзе ажыццяўляцца на дагаворных умовах, для грамадзян Рэспублікі Беларусь прадугледжаны як бюджэтная, так і платная формы атрымання адукацыі.

Андрэй Іванец звярнуў увагу на тое, што ў апошнія гады праведзена сур'ёзная работа па ўдасканаленні падыходаў у арганізацыі школьнага харчавання. «Пералік страў, так званых тэхналагічных карт, сёння дастаткова пашыраны, — канстатаваў ён. — Тыя стравы, якія яшчэ раней немагчыма было ўявіць у школьных сталовых, прадстаўлены школьнікам».

Праведзена сур'ёзная работа па мадэрнізацыі харчовых блокаў, сталовых. «Фактычна, кожная трэцяя школа краіны за апошнія два гады атрымала мадэрнізаваны харчблок, — удакладніў кіраўнік ведамства. — Праводзіцца сур'ёзная работа па ўкамплектаванні кадраў, да кухара школьнай сталовай прад'яўляюцца вельмі сур'ёзныя патрабаванні. Каб атрымаць адпаведны, чацвёрты, разрад, каля 1,5 тысячы спецыялістаў школьных сталовых летась прайшлі павышэнне кваліфікацыі».

### СІСТЭМНЫЯ МЕРЫ ПАДТРЫМКІ МОЛАДЗІ

**Міністр працы і сацыяльнай абароны Наталля Паўлючэнка** адзначыла, што ў краіне дзейнічае сур'ёзная сістэма мер падтрымкі маладых спецыялістаў. Гэта і аднаразовая выплата, калі малады чалавек прыступае да

# ДА РЭАЛІЙ СЁННЯШНЯГА ДНЯ ЧАГО ГЭТА КАШТУЕ»

## акцэнты нарады Прэзідэнта з кіраўніцтвам Саўміна

«Калі кажу пра тое, што трэба БЧ падтрымліваць, то ўспамінаю нядаўнія даклады праваахоўных органаў — мы нямала службовых асоб адправілі на «пасядзелкі». І яны прыйшлі прасіць грошы з бюджэту ці нейкай дапамогі, адтэрміноўкі, растэрміноўкі? — заўважыў Прэзідэнт. — І яшчэ — ці дастаткова зацягнулі паясы? Не можаце — зацягвайце паясы. Пачняце, прабачце мяне за непапулярнасць, паміраць — тады прыходзьце, будзем думаць, што з вамі рабіць».

Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся, ці ўсё пралічана, ці забяспечаць прапанаваныя меры фінансавую стабілізацыю. «І ці не прыйдзеце вы ў гэты кабінет з працягнутай рукой, як гэта звычайна ў нас бывае, праз год, тры, пяць?»

**Другое.**

### ФУНКЦЫЯНАВАННЕ МАГІСТРАТУРЫ

«Некалькі гадоў таму мы на гэту тэму з вамі шырока пагаварылі і вызначыліся: нікага Балонскага працэсу. У нас нармальная адукацыя», — нагадаў Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што адзінкі з кіраўніцтва Саўміна заканчвалі магістратуру, таму што атрымалі добрую базу адукацыі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў свой час было прапанавана ўкараніць у беларускую сістэму адукацыі так званы Балонскі працэс, каб падрыхтаваць спецыялістаў, на якіх будзе попыт за межамі краіны. «Вы што, у беларускіх універсітэтах будзеце рыхтаваць для замежжа людзей?» — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік дзяржавы. Але, з іншага боку, звярнуў увагу ён, у нас вучыцца шмат замежнікаў, якія хацелі б скончыць магістратуру і быць запатрабаванымі ва ўсім свеце. «Добра. Давайце так і паступім: яны плацяць грошы за ўсё, за магістратуру — прыходзьце, навучайцеся ў магістратуры ў тым ліку, колькі хочаце гадоў. Вашы грошы — мы вас навучаем, едзьце куды заўгодна працаваць», — прапанаваў адзін з варыянтаў Прэзідэнт. Ён нагадаў пра рашэнне накont таго, што магістрантамі будуць тыя, хто будзе займацца навукай і выкладаннем. І спытаў, як ідуць справы цяпер.

**Трэцяе.**

### НАВЯДЗЕННЕ ПАРАДКУ Ў АРГАНІЗАЦЫІ ХАРЧАВАННЯ ВА ЎСТАНОВАХ АДУКАЦЫІ

Гэта пытанне знаходзіцца на пастаянным кантролі кіраўніка дзяржавы.

> **«Я вас неаднаразова папярэджваў: абкрадаць дзяцей, труціць іх няякаснай ежай — злачынна!» — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.**

Прэзідэнт нагадаў, што ў свой час ім было дадучана выпрацаваць нармальную сістэму забеспячэння харчаваннем усіх устаноў адукацыі. «Або мы дзесьці будзем гатаваць (на прыкладзе Мінска ўзяць) абеды і гэтак далей, як зрабілі ў Маскве, Расіі, — агучыў канкрэтную прапанову кіраўнік дзяржавы. — Толькі па-нармальнаму будзем забяспечваць. Не прыбліжаным аддадзім гэты бізнес, а дзяржава возьме на сябе абавязкі. Дапусцім, у Мінску прыгатавалі на нейкай кухні — адвезлі па школах, раздалі. Усё дакладна і зразумела. Колькі абедаў: колькі трэба, столькі і аддалі».

Акрэсліў беларускі лідар і цяперашнюю сітуацыю, звязаную з арганізацыяй харчавання ў навучальных установах. «У кожнай школе ў нас сталовая — чытай, забягалаўка, куды ходзяць вашы дзеці, — заўважыў ён. — Мае ўжо не ходзяць, вашы ходзяць. Што там гатуюць, як гатуюць, хто гатуе? Цяжка ўявіць. Хоць вы мне пішаце: у вас усё пад кантролем. Слухайце, вы што, мяне незямным чалавекам лічыце? Ды немагчыма гэта пракантраляваць. Асабліва крадзеж».

Кіраўнік дзяржавы канстатаваў: на гэтым пападаліся шмат разоў – і выказаў упэўненасць, што і цяпер падобнае адбываецца. «У вас таксама гэта пад кантролем? — пацікавіўся ён ва ўдзельнікаў нарады. — Немагчыма гэта пракантраляваць!»

Звярнуў увагу Прэзідэнт і на яшчэ адну праблему. «Адходаў — палова, — канкрэтызаваў Аляксандр Лукашэнка. — Дзеці або не ядуць, бо нясмачна, або не хочуць есці. Усё ідзе ў адходы. Можна ўтрымліваць свінаводчы комплекс пры кожнай школе для таго, каб адходамі карміць свіней або, можа, нейкую іншую жывёлу. Гэта нармальна?»

Беларускі лідар удакладніў, што зроблена для таго, каб гэтага не было. «Як будзем карміць дзяцей, каб было смачна, карысна, каб ежа была не астылай? — пацікавіўся ён. — Па меншай меры, пакуль будзеце вазіць з нейкага цэнтра і гэтак далей».

Па словах Прэзідэнта, амаль дзве трэці навучэнцаў краіны харчуецца ў навучальных установах. І дзяржава выдаткоўвае каласальныя грошы на тое, каб накарміць дзяцей.

Удакладніўшы, як ідуць справы цяпер, Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як прымалася рашэнне. «Гэта было ў тыя 1990-я гады, пачынаючы ад Чарнобыля, — распавёў ён. — Адзінае, што мы маглі тады сабе дазволіць, калі я прыязджаў у тыя вёскі, каб дзеці не памерлі з голаду, мы іх павінны былі добрым абедам накарміць у школах. Тады была прапанова — увогуле выключыць усялякую кармёжку: няма грошай. Мной было прынята адваротнае рашэнне: дзяцей будзем карміць! Бо ў пераважнай большасці сем'яў гэтых дзяцей накарміць нармальна не маглі. Дык давайце іх хоць бы абедам накормім...»



**Чацвёртае.**

### ПАДТРЫМКА МОЛАДЗІ

Урадам унесены на разгляд праект Указа «Аб мерах падтрымкі моладзі», накіраванагаы на вырашэнне важнага пытання — фарміраванне ўмоў для прыцягнення і захавання маладых кадраў на прадпрыемствах.

На ўнесеныя прапановы кіраўнік дзяржавы адказаў зноў, як ён заўважыў, непапулярна. «Мы сёння дапамагаем усім, — падкрэсліў ён. — Усім дапамагаем! Ёсць грошы, няма грошай — усім дапамагаем». У гэтым кантэксце ён папярэдзіў аб маючай адбыцца ў пятніцу нарадзе ў Віцебскай вобласці, калі кіраўніцтва стане зноў прасіць дапамогу: «Забудзьцеся! Усё, што трэба было, далі. І што? Яшчэ даць? Тады скажыце, у каго забраць...»

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*



працы, і штомесячныя выплаты ў выглядзе надбаўкі, іншае. Яна нагадала, што нядаўна кіраўнік дзяржавы падпісаў указ аб надбаўках маладым спецыялістам, якія працуюць у сельскай мясцовасці. Гэта асаблівыя меры для працуючых у аграпрамысловым комплексе. Гэта сістэмная работа датычыцца не толькі прамых сацыяльных выплат, але і фіскальных мер. З 2024 года для маладых спецыялістаў павышаны падатковы вылік.

«Вядома, усе гэтыя меры сістэмныя і ідуць адна за адной, — звярнула ўвагу Наталля Паўлючэнка. — Сёння мы гаварылі аб мерах, якія больш датычыліся б наймальніка. Гаворка ішла аб фарміраванні пэўнага пула наймальнікаў, якія маглі б у першачарговым парадку прэтэндаваць на таго ці іншага студэнта».

На нарадзе таксама абмяркоўвалася магчымасць увядзення надбаўкі да стыпендыі тым, хто вучыцца па мэтавым накіраванні. «Сёння 63 % наймальнікаў, якія прымаюць маладых спецыялістаў у сельгасарганізацыі, ужо даюць такую надбаўку да стыпендыі, — канстатавала міністр. — Памеры розныя, у залежнасці ад магчымасцяў наймальнікаў: ад адной базавай велічыні да 14 базавых велічынь. Ёсць наймальнікі, якія даплачваюць да стыпендыі і па 500 рублёў. Абсалютна справядлівая заўвага Прэзідэнта аб тым, што мы залішне апекаваць моладзь не павінны, залішніх мер падтрымкі быць не павінна. І мы працуем у гэтым рэчышчы».

Паводле слоў Наталлі Паўлючэнка, меры па стымуляванні маладых спецыялістаў не абмяжоўваюцца ўказам, які быў вынесены на разгляд кіраўніка дзяржавы. «Мы будзем працаваць, прапаноўваць і выпрацоўваць новыя прапановы ў рамках тых, якія сёння разглядалі», — удакладніла яна.

### ПАТРЭБНЫЯ ЯКАСЦЬ І ХУТКАСЦЬ



**Начальнік Дзяржаўнага аб'яднання «Беларуская чыгунка» Валерый Вярэніч** расказаў, што праект распараджэння аб дзяржаўнай падтрымцы «Беларускай чыгункі» падтрыманы. У прыватнасці, адобрана адтэрміноўка выплат па крэдытах да 2035 года.

«Гэта накладвае пэўныя абавязацельствы на калектыў чыгункі, мабілізуе нашы намаганні па ўсіх кірунках, а іх дастатковая колькасць для таго, каб атрымаць у найбліжэйшай будучыні той вынік, які мы прапісвалі і фарміравалі ў сваіх бізнес-планах», — растлумачыў ён.

Валерый Вярэніч расказаў пра некаторыя аспекты дзейнасці чыгункі. Так, сёння сумесна з аблвыканкамамі пераглядаюцца ўчасткі курсіравання цягнікоў рэгіянальных ліній эканом-класаў, якія мала задзейнічаны. Ёсць таксама праграма, у рамках якой у некаторых гарадах дзеля аптымізацыі аб'ядноўваюцца чыгуначныя і аўтамабільныя вакзалы. На такія меры ўжо пайшлі ў Пінску, Слоніме, дзе гэтыя прыклады сябе добра зарэкамендавалі. На чарзе — Магілёў.

«Патрабуюцца якасць і хуткасць, — удакладніў ён, кажучы аб мерах, накіраваных на паляпшэнне становішча Беларускай чыгункі. — Нашы намаганні накіраваныя на забеспячэнне хутчэйшых зносін паміж населенымі пунктамі».

Што датычыцца пераарыентацыі грузапатокаў пасля закрыцця заходніх рынкаў, Валерый Вярэніч адзначыў, што трансфармацыя патокаў адбылася ў першую чаргу з акцэнтам на расійскі і кітайскі напрамкі. «Сёння паток «Кітай — Еўропа» па аб'ёме крыху ніжэйшы, чым паток «Кітай — Беларусь», «Беларусь — Кітай». Гэта значыць, мы сувымерны лічбы дасягнулі, — канстатаваў ён. — Раней мы ўкладваліся ў развіццё інфраструктуры на заходнім кірунку. А сёння разумеем, што трэба развіваць абласныя цэнтры і пункты фарміравання кантэйнераў, з прадпрыемствамі ствараць інфраструктуру для пагрузкі тавараў у кантэйнеры. Ёсць транзіт, ёсць унутрырэспубліканскія адносіны, ёсць увоз, ёсць вываз. Па кожным з гэтых пунктаў мы бачым няхай і невялікі, але ўсё ж такі рост».

# «ДАВАЙЦЕ ВЯРТАЦЦА ДА РЭАЛІЙ СЁННЯШНЯГА ДНЯ І РАЗУМЕЦЬ, ЧАГО ГЭТА КАШТУЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Я не да таго, што моладзі не трэба дапамагаць, але і апякаць празмерна там, дзе моладзь павінна працаваць, мы нікога не павінны, — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

— Не таму, што мы варвары нейкія: у нас мора нечага ляжыць, і мы не даём. У нас няма нічога лішняга. Сёння складаная сітуацыя. Кожны дзень прэм'ер, віцэ-прэм'ер — на «допыце» па прамысловасці. Таму трэба дапамагчы, неяк прадаць і іншае, каб атрымаць грошы. Цiснуць з усiх бакоў. А мы сёння кажам: мы дапаможам моладзі. А ці дапаможам? Вось прымем цяпер рашэнне (вы мне прапануйце прыняць), мы зможам дапамагчы ў тым аб'ёме, як можам?»

Каласальную падтрымку дзяржава аказвае шматдзетным сем'ям. «Гэта прыярытэт прыярытэтаў, — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт. — Так будзе і далей. Ваеннаслужачыя, шматдзетныя — па жыллі пытанне нумар адзін».

Разам з тым падтрымка шматдзетных сем'яў вылілася ў свайго роду праблему. «Пачалі будаваць жыллё ў Мінску, у зручных месцах, сцягваючы працоўную сілу ў гарады», — канкрэтызаваў кіраўнік дзяржавы. Па словах беларускага лідара, шматдзетныя сем'і павінны жыць па ўсёй краіне. «Раўнамернае, называецца, размеркаванне працоўных рук, рабочай сілы, як гэта было ў савецкія часы, — удакладніў ён. — Гэта па-першае. Па-другое, шматдзетнай сям'і, як я разумею, дапамаглі з жыллём, далі сямейны капітал. А далей участак — паўгектара, гектар — пяцёра дзяцей. Трэба варушыцца ў гэтай зямлі і нешта рабіць сваімі рукамі. Мы пра гэта забылі, пачалі ў Мінску, абласных цэнтрах будаваць жыллё для шматдзетных». Прэзідэнт нагадаў, што прасіў разабрацца з тым, каму выдзяляецца жыллё з дзяржпадтрымкай: «Што гэта за шматдзетныя сем'і, разбірацца трэба ў дэталях».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ён не супраць дапамагаць моладзі. «Але давайце мы нарэшце вызначымся, перастанем завываць, што моладзь — наша будучыня, і ёй трэба дапамагчы, — прапанаваў Прэзідэнт. — Давайце канкрэтна скажам, у чым мы павінны дапамагчы моладзі, і паставім на гэтым кропку».

Прапановы дапамагаць моладзі выключна за кошт дзяржавы беларускі лідар не адабрае.

> **«Малады чалавек, ён што — стары, не можа зарабіць? Мы павінны стварыць умовы, каб моладзь зарабіла, — акцэнтаваў Прэзідэнт.**

— У нашы часы такіх умоў не было, і на другой рабоце ты не мог працаваць. Калі ты, крый божа, кіраўнік, камуніст, табе проста не дазволілі б дадатковыя гэтыя заробкі. Цяпер — калі ласка, зарабляй грошы і вырашай свае сямейныя праблемы».

Аляксандр Лукашэнка вобразна заўважыў, што Беларусь — не Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, дзе аглоблю ўткнуў у зямлю — нафта пайшла, і не Катар, дзе ўткнуў кій у пясок — пайшоў газ. «Нам усё трэба зарабіць рукамі, — падкрэсліў ён. — І калі мы пэўнай катэгорыі нашага грамадства аказваем дапамогу і падтрымку, мы павінны разумець, што гэта за кошт тых, хто працуе. Я хачу, каб вы гэту філасофію разумелі, уносячы прапановы на мой узровень. А я вам шчыра пра гэта сказаў. І няхай людзі, пачуўшы мяне, ацэньваюць гэта, як лічаць патрэбным».

Прэзідэнт заклікаў паглядзець на гэтае пытанне аб'ектыўна. «Хутка гэтыя 4 мільёны тых, хто сёння працуе, сагнуцца, — сказаў ён. — Мы ім не зможам заробак нармальны плаціць. Хто будзе працаваць? Адкуль возьмем грошы? Давайце вяртацца да рэалій сённяшняга дня і разумець, чаго гэта каштуе».

Па словах кіраўніка дзяржавы, каб вырабіць патрэбныя тавары, Беларусь купляе сыравіну за межамі краіны. «І будзем заўсёды купляць, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Бог у гэтым плане нас абдзяліў. Дык давайце будзем зыходзіць з рэалій, а не закідваць сюды: «Давай ільготы, ільготы, ільготы». Яшчэ раз падкрэсліваю: не таму, што я працўнік гэтага, а таму, што ў нас гэтыя льготы няма чым ільгаціраваць. А тыя, хто сёння працуе (вось яны — перада мной стаяць, журналісты і вы ў тым ліку), вы што, гатовы палову са свайго заробку ўзяць і аддаць на льготы камусьці?..»

**Вераніка КАНЮТА, Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**



# НА АБ'ЕКТЫ НАШАЙ ПАМЯЦІ

## Куды пойдуць сродкі, заробленыя на заўтрашнім суботніку

Заўтра пройдзе рэспубліканскі суботнік. На сваіх працоўных месцах і на добраўпарадкаванні тэрыторый будзем працаваць усёй краінай. А заробленыя грошы пойдуць на важныя для краіны і кожнага яе грамадзяніна аб'екты — яны звязаныя з нашай гістарычнай памяццю, а значыць, з незалежнасцю і суверэнітэтам нашай краіны.

50 % грашовых сродкаў, якія паступілі, згодна з адпаведнай пастановай Савета Міністраў, будуць накіраваны Міністэрству культуры на будаўніцтва Нацыянальнага гістарычнага музея Беларусі і стварэнне яго пастаяннай экспазіцыі з магчымасцю выкарыстання гэтых сродкаў у 2025—2027 гадах. Палова ж грашовых сродкаў застаюцца ў распараджэнні аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама з магчымасцю выкарыстання гэтых сродкаў у 2025-2026 гадах.

У рэгіёнах заробленыя на суботніку грошы размяркуюць наступным чынам.

• **Брэсцкі аблвыканкам** накіруе сродкі на будаўніцтва трэцяй чаргі Рэспубліканскага цэнтра патрыятычнага выхавання моладзі. Ён месціцца на базе Кобрынскага ўмацавання Брэсцкай крэпасці. У час трэцяй чаргі будзе аднаўлены заходні форт, дзе размесціцца забаўляльна-асветны комплекс, і добраўпарадкавана прылеглая тэрыторыя.

• **На Віцебшчыне** сродкі пойдуць на ўзвядзенне стэлы «Орша — горад працоўнай славы. 1941 — 1945». Гэта ганаровае званне сёлета было прысвоена Оршы па рашэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД за ўклад у перамогу над фашызмам і працоўны подзвіг жыхароў горада. Цяпер кіпяць работы ў скверы, галоўным элементам якога будзе стэла вышынёй 9 метраў на круглым подыуме. Перад ёй — трохкутная плошча, да якой з розных канцоў сквера вядуць шырокія дарожкі. Папярэдне закладзены электракамунікацыі.

• **У Гродзенскай вобласці** сродкамі з суботніка прафінансуюць добраўпарадкаванне Жыровіцкага манастыра як духоўнага цэнтра для праваслаўных вернікаў і паляпшэнне інфраструктуры самага населенага пункта. Там жа на суботніку будзе працаваць і калектыў Гродзенскага аблвыканкама — планующа прыбраць занядбаныя пабудовы, дзікарослую расліннасць і разбіць прыгожы парк.

• **На Гомельшчыне** частка сродкаў, заробленых падчас удзелу ў рэспубліканскім суботніку, будзе накіравана на рэканструкцыю комплексу воінскай славы ў гонар аперацыі «Баграціён» у Светлагорскім раёне.

• **У Магілёўскай вобласці** заробленыя на суботніку грошы пойдуць на рамонт і добраўпарадкаванне месцаў баявой і воінскай славы ў Шклове — мемарыяльнага комплексу «Памяць», Алеі Герояў і стэлы на левым беразе Дняпра.

• Сродкі, заробленыя на суботніку і пакінутыя ў распараджэнні **Мінскага аблвыканкама**, будуць накіраваны на распрацоўку праектна-каштарыснай дакументацыі аб'ектаў, што ўваходзяць у склад гісторыка-культурнай каштоўнасці «Гарадзішча «Вал» у Заслаўі. «Пры падрыхтоўцы да абласнога фестывалю «Дажынкі» пачаліся раскопкі ў гэтым гістарычным месцы, што стала знакавай падзеяй да 1040-гадовага юбілею горада. У перспектыве тут з'явіцца музей пад адкрытым небам. Таксама сродкі будуць накіраваны на закупку медыцынскага абсталявання хірургічнага корпуса абласной клінічнай бальніцы, які будуецца», — расказалі ў Мінаблвыканкаме.

• Сродкі, якія застануцца ў распараджэнні **Мінскага гарвыканкама**, плануецца выдаткаваць для экспазіцыйнай пляцоўкі ў мемарыяльным комплексе «Трасцянец», у прыватнасці, на рэканструкцыю будынкаў пад інфармацыйны цэнтр экскурсійнага абслугоўвання мемарыяльнага комплексу.



# «ГЭТА НАША МЕСЦА СІЛЫ»

## Члены беларускай партыі «Белая Русь» сталі чарговымі наведвальнікамі Палаца Незалежнасці

Нягледзячы на тое, што ў будынку часта праходзяць важныя палітычныя мерапрыемствы і сустрэчы з замежнымі дэлегацыямі, яго дзверы, дзякуючы распараджэнню Прэзідэнта, адчынены для ўсіх, хто выкажа жаданне яго наведаць. Учора экскурсія ў палацы была праведзена для 110 членаў партыі «Белая Русь» — аднаго з самых масавых палітычных аб'яднанняў краіны. Для больш чым 73 тысяч чалавек патрыятызм з'яўляецца сапраўдным жыццёвым арыенцірам.

«Сёння ў нас тут сабраліся найлепшыя з найлепшых — прадстаўнікі ўсіх рэгіёнаў краіны, якія не словам, а справай штодня даказваюць адданасць сваёй краіне, Прэзідэнту і народу, — падкрэсліў **намеснік старшыні Беларускай партыі «Белая Русь» Андрэй БУГРОЎ**. — Для нас, партыйцаў, знаходзіцца ў палацы вельмі сімвалічна. Я сказаў бы, гэта наша месца сілы. Тут вырашаюцца важныя дзяржаўныя пытанні, тут Прэзідэнт прыносіць прысягу народу, сюды прыязджаюць паслы для абмеркавання сумесных праектаў. Гэтыя сцены прасякнуты добрай энергетыкай, і, паверце, любы беларус хацеў бы тут апынуцца».





**По традыцыі адкрывае праграму візіту ў Палац Незалежнасці яго самая грандыёзная зала — Зала ўрачыстых цырымоній, якая не мае аналагаў у краіне па маштабах. Менавіта тут гасцей чакае афіцыйнае прывітанне ад імя Прэзідэнта. Дарэчы, памяшканне мае асаблівы статус: яно двойчы рабілася месцам правядзення цырымоніі інаўгурацыі кіраўніка дзяржавы — у 2015 і 2020 гадах. А яшчэ ў Зале ўрачыстых цырымоній укаранілася традыцыя правядзення навагодніх баляў.**

Тут жа гасцей з задавальненнем знаёмяць з гісторыяй будаўніцтва маштабнага праекта. Будынак удала ўпісаўся ў па-сапраўднаму патрыятычны квартал сталіцы: па суседстве знаходзяцца плошча Дзяржаўнага сцяга, парк Перамогі, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і стэла «Мінск — горад-герой». Безліч станоўчых эмоцый атрымаў ад экскурсіі **начальнік галоўнага ўпраўлення спорту і турызму Мінаблвыканкама Раман КУЗНЯЦОЎ**, адзначаючы фантастычную энергетыку палаца і важнасць такіх экскурсій: «Сучаснасць паказала, што наша дзяржаўнасць, незалежнасць і талерантны народ сёння — самае галоўнае. І наша задача — захаваць гэта для будучых пакаленняў, як мага больш пакінуць пасля сябе інфармацыі, ідэй, каб у далейшым не толькі расказваць, але і ўвасабляць жыццё».

Праца беларускіх майстроў, рукамі якіх з айчынных матэрыялаў зроблены палац, і сёння выклікае асаблівае захапленне ў наведвальнікаў: «Мяне ўразілі дэталі, пра якія нам расказалі на экскурсіі. Напрыклад, аказваецца, тая самая «нармандская чацвёрка» засядала ў пакоі, які да таго часу зусім не выкарыстоўваўся. А сядзелі кіраўнікі дзяржаў, дарэчы, у крэслах беларускай вытворчасці, якія прыехалі ў палац з Маладзечна, — дзеліцца толькі што пачутым **Наталля ПШАНІЧНАЯ, дырэктар сярэдняй школы № 226 г. Мінска**. — Вось гэта і ёсць сапраўдная гісторыя, прычым паказаная не буйнымі мазкамі, а дробнымі дэталямі, якія дазваляюць адчуць сябе да яе датычным».

«Я ў палацы раней не была, але заўсёды марыла сюды трапіць. Ён уражвае, нават калі проста глядзіш на яго па тэлевізары, а калі падыходзіш да будынка — проста сэрца замірае ад гонару, — падзялілася ўражаннямі **дырэктар гімназіі № 50 г. Мінска Лола ПАХОМАВА**. — Рада, што мне сёння далі магчымасць асабіста ўбачыць адзін з сімвалаў беларускай дзяржаўнасці. З першых жа хвілін адчуваецца, як беражліва тут ахоўваецца гісторыя нашай краіны».

З'язджаюць наведвальнікі з яркімі ўражаннямі, якімі яшчэ доўга будуць дзяліцца з роднымі і калегамі. Кожны пакідае сцены палаца з добрым настроем і новымі сіламі для працы дзеля росквіту сваёй Радзімы.

**Аміна НАЗАРАВА.**
**Фота аўтара і БелТА.**




ИЗВЕЩЕНИЕ О НАЛИЧИИ ОСНОВАНИЙ
ДЛЯ ПРИЗНАНИЯ ЖИЛОГО ДОМА ПУСТУЮЩИМ

**Капланецкий сельский исполнительный комитет** извещает, что постоянно действующей комиссией по обследованию состояния жилых домов, расположенных на территории Березинского района, в ходе обследования выявлен жилой дом, **расположенный по адресу: Минская область, Березинский район, д. Августово, ул. Подлесная, д. 1** (адрес указан согласно похозяйственной книге), имеющий основания для признания его пустующим.

**Сведения о жилом доме (из акта)**
Наружные размеры одноквартирного жилого дома: 5 х 10 м.
Площадь: 44,0 кв. м.
Дата ввода в эксплуатацию одноквартирного жилого дома: 1970 года постройки.
Материал стен: деревянный. Этажность: одноэтажный.
На придомовой территории не осуществляются предусмотренные законодательством мероприятия по охране земель.
Не соблюдаются требования к содержанию (эксплуатации) территории.
Сведения о лицах, включая наследников, которым предположительно одноквартирный жилой дом принадлежит на праве собственности, хозяйственного ведения или оперативного управления, иных лицах, имеющих право владения и пользования им: собственник – Слабко Мария Лаврентьевна (умерла в июле 2000 г.), наследник – Рябцева Галина Филипповна.
Предположительный срок непроживания в одноквартирном жилом доме собственника, иных лиц, имеющих право владения и пользования этим домом: более 10 лет.
От лиц, имеющих право пользования жилым домом, в Капланецкий сельский исполнительный комитет не поступило уведомлений о намерении использовать такой дом для проживания.
Капланецкий сельский исполнительный комитет просит всех заинтересованных лиц в течение двух месяцев со дня опубликования извещения уведомить Капланецкий сельский исполнительный комитет о намерении использовать пустующий дом для проживания.

**Телефоны для справок: 801715 62 3 32, 801715 62 3 33.**
УНП 600092462



**ООО «Реалконсалтинг»**
**извещает о проведении повторного открытого аукциона № 26/25**
**по продаже торгового помещения в Бобруйске**

Предмет аукциона: Лот № 1 – **Изолированное помещение с инвентарным номером 710/D-3949, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Октябрьская, 136-103, площадь – 883,3 кв. м, наименование – Помещение магазина, назначение – Торговое помещение.**
Обременение: ипотека.
Начальная цена – 1 624 500 белорусских рублей

Аукцион проводится **13.11.2025 с 10.00 до 16.00** в форме электронного аукциона на электронной торговой площадке «РЕАЛТОРГИ» по адресу: https://realtorgi.by/ (далее – ЭТП).
**Заявки на участие в аукционе принимаются по 12.11.2025 включительно до 17.00**

**Для участия в аукционе необходимо:**
1. внести задаток в размере 1000 рублей на расчетный счет продавца BY59PJCB30125124941000000933 в ОАО «Приорбанк», БИК PJCBBY2X, получатель платежа – ООО «Ритейл Репаблик», назначение платежа – «Задаток для участия в повторном аукционе № 26/25»;
2. пройти регистрацию на ЭТП и подать заявку на участие в аукционе с приложением документов, предусмотренных Регламентом ЭТП

Аукцион проводится в соответствии с Регламентом ЭТП (размещен по адресу: https://realtorgi.by/reglament-etp). Подавая заявку на участие в аукционе, участник аукциона принимает условия размещенного на странице лота (вкладка «Договор и документы») соглашения о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения электронного аукциона.
Победителем аукциона объявляется участник, предложивший наибольшую цену. Шаг аукциона: 5 процентов от начальной цены. В случае если заявка на участие по лоту подана только одним участником (далее – единственный участник), лот продается этому участнику с его согласия по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.
Победитель аукциона (единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона) возмещает организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 рабочих дней со дня его проведения.
Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона – в течение 20 дней со дня проведения аукциона. Срок оплаты предмета аукциона по договору купли-продажи – в течение 30 дней со дня проведения аукциона, если стороны договора не договорятся об ином сроке.
Победителю аукциона (единственному участнику, согласившемуся приобрести предмет аукциона по цене, увеличенной на 5 процентов) внесенный задаток учитывается в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи предмета аукциона, другим участникам – возвращается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона. Собственник имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до даты проведения аукциона

**Организатор аукциона и оператор ЭТП: ООО «Реалконсалтинг», УНП 191302068, г. Минск, ул. Пономаренко, 35А, пом. 701, каб. 8. тел.: +375 (17) 256 61 35, +375 (25) 549 86 22 auction@expertiza.by, https://www.expertiza.by.**
**Продавец – ООО «Ритейл Репаблик», г. Барановичи, ул. Советская, д. 55, УНП 291372360**

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» 13.09.2025



Пасведчанне № 01-190 аб пастаноўцы на ўлік, выдадзенае пярвічнай арганізацыі камунальнага ўнітарнага шматгаліновага прадпрыемства жыллёва-камунальнай гаспадаркі «Баранавіцкая гарадская жыллёва-камунальная гаспадарка» Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», пастаўленае на ўлік рашэннем Баранавіцкага гарадскога выканаўчага камітэта ад 26 лютага 2008 года № 450, **лічыць несапраўдным у сувязі са стратай.**
УНП 200167124



Утерянный представительством Белгосстраха по Советскому району г. Минска бланк с определенной степенью защиты Квитанция о приеме наличных денежных средств (страховых взносов), форму 1-СУ, серии ВВ, № 3598452, в количестве 1 экземпляра **считать недействительным.**
УНП 100122726

# «ЧАСУ НА АБКАТКУ ПІЛОТНЫХ РАШЭННЯЎ НЯМА»

## У Мінску абмеркавалі прапановы для развіцця эканомікі



Міжнародная навуковая канферэнцыя «Праблемы прагназавання і дзяржаўнага рэгулявання сацыяльна-эканамічнага развіцця» праходзіць у Мінску, паведамляе БелТА.

У любой эканамічнай сістэме неабходна рабіць прагнозы: доўгатэрміновыя, сярэднетэрміновыя і кароткатэрміновыя.

— У нас выбудавана сістэма прагназавання, распрацавана Нацыянальная стратэгія ўстойлівага развіцця да 2040 года. Цяпер мы на стадыі распрацоўкі дакумента на пяць гадоў, а таксама штогод фарміруем прагнозы па дасягненні пастаўленых мэт. Пры падрыхтоўцы дакументаў мы будуем шматварыянтныя прагнозы, на падставе якіх прымаюцца рашэнні ў залежнасці ад сітуацыі. Мэтавыя арыенціры, закладзеныя ў гэтых праграмах, падтрымліваем мерамі для іх дасягнення, — падкрэсліў у гутарцы з журналістамі **першы намеснік міністра эканомікі Іван ВЕЖНАВЕЦ**.

Пры фарміраванні прагнозных дакументаў ацэньваецца рост эканомікі ў свеце і ў асноўных краін-партнёраў, на якія арыентуецца Беларусь. Канкрэтныя значэнні будуць пазначаны і растлумачаны пасля зацвярджэння ўсіх дакументаў.

Асноўныя акцэнты для эканомікі цяпер — трансфармацыя ў новыя кірункі.

— У першую чаргу гэта лічбавізацыя эканомікі і ўсёй эканамічнай дзейнасці ў краіне. Гэта пераход на новыя тэхналагічныя ўклады на існуючых прадпрыемствах, укараненне рабатызацыі і беспілотных сістэм, а таксама фарміраванне новых кампетэнцый, якія ўжо пачынаюць з'яўляцца і развівацца. Напрыклад, біятэхналогіі, беспілотныя лятальныя апараты і беспілотныя сістэмы ў цэлым, — растлумачыў Іван Вежнавец.

Ён звярнуў увагу, што канферэнцыя праводзіцца НДЭІ Мінэканомікі ўжо 26-ы раз.

— Гэта падзея праходзіць штогод з 2000-га. У Беларусі праводзіцца дастаткова шмат навуковых канферэнцый. Для нашага інстытута яна важная як пляцоўка для абмеркавання задач дзяржаўнага кіравання, а таксама практычных пытанняў і механізмаў, — падкрэсліў першы намеснік міністра. — Сёння мы выбудоўваем новую архітэктуру кіравання сацыяльна-эканамічным развіццём. Гэты працэс ідзе дынамічна і досыць складана. Часу на разварушванне і абкатку пілотных рашэнняў няма. Мы павінны даваць практычныя адказы тут і зараз, без доўгіх паглыбленняў у тэорыю.

Канферэнцыя таксама выступае як пляцоўка для сумеснага мазгавога штурму прадстаўнікоў навуковай супольнасці, бізнесу і органаў дзяржаўнага кіравання.

— Кожная прапанова мае шанц быць пачутай, прайсці экспертнае абмеркаванне і легчы ў аснову рашэнняў у сферы дзяржаўнага рэгулявання і сацыяльна-эканамічнага развіцця. Прысутнасць і актыўная ўцягнутасць калег з іншых краін шматразова пашыраюць аб'ём экспертызы, што павышае каштоўнасць рэкамендацый, якія рыхтуе форум, — сказаў Іван Вежнавец.

Прагнозныя ўмовы, у якіх фармуюцца контуры і практычнае напаўненне наступнай пяцігодкі, кардынальна адрозніваюцца ад папярэдніх.

— Патрэбна канцэнтрацыя рэсурсаў, якая дазволіць выйсці на новы віток развіцця эканомікі з новымі тэхналогіямі і пунктамі росту, — падсумаваў першы намеснік міністра эканомікі.

# АКТУАЛЬНАЕ

## БУТБ пачала індэксаў праз лічбавую таварнай

У рамках праекта па стварэнні міжнароднай сістэмы індыкатараў таварных рынкаў на прасторы ЕАЭС — Узбекістан Беларуская ўніверсальная таварная біржа пачала прадастаўляць даныя па біржавых цэнавых індэксах для далейшай трансляцыі праз інфармацыйна-аналітычную платформу SPX, распрацаваную Пецярбургскай біржай — найбуйнейшай таварнай біржай Расіі, паведамілі ў БУТБ.

У выніку карыстальнікі расійскай платформы атрымалі доступ да больш чым 60 індэксаў, што адлюстроўваюць актуальныя цэнавыя тэндэнцыі па пяці таварных групах, на долю якіх прыпадае значная доля тавараабароту БУТБ. На ўнутраным рынку гэта чорныя металы, круглыя лесаматэрыялы і шроты алейных культур, а на знешнім — піламатэрыялы і сметанковае масла. Індэксы БУТБ абнаўляюцца штомесяц, а методыка іх разліку распрацавана сумесна



**20 ноября 2025 г.** **№ 10-Н/2025**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ

## по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с продажей права частной собственности на земельный участок в г. Гомеле

| № лота | Наименование объекта / адрес земельного участка: г. Гомель | Целевое назначение / вид вещного права | Кадастровые номер, площадь земельного участка | Начальная стоимость, руб. | Сумма задатка, руб. | Расходы на подготовку док-ции, руб. | Наличие ограничений, обременений |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-741 (по генплану), ул. Новаторская, 114 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома / частная собственность | 340100000008002666 0,0840 га | 36 059,22 | 6 851,25 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, охранная зона водопроводных сооружений, расположение на приаэродромной территории, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
| 2 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-1616 (по генплану), ул. Поселковая, 162 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома / частная собственность | 340100000008003925 0,0780 га | 31 826,15 | 6 046,97 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, охранная зона водопроводных сооружений, расположение на приаэродромной территории, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
| 3 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-1653 (по генплану), ул. Поселковая, 197 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома / частная собственность | 340100000008004006 0,0840 га | 52 509,12 | 9 976,73 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, охранная зона водопроводных сооружений, расположение на приаэродромной территории, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
| 4 | Не завершенный строительством жилой дом в районе индивидуальной жилой застройки Романовичи У-385 (по генплану), ул. Родная, 111 | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома / частная собственность | 340100000008002183 0,0840 га | 30 322,67 | 5 761,31 | Ориентировочно 5 000,00 | Зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, охранная зона объектов газораспределительной системы, охранная зона водопроводных сооружений, расположение на приаэродромной территории, обременения в связи с размещением на земельном участке фундамента, следов земляных работ |
**8.15, 18.30 «Зямля Саннікава». Мастацкі фільм (12+).**
**9.50 «Прыходзьце заўтра...» Мастацкі фільм (12+).**
**11.30** «Палітра Перамогі».
**12.05** «Паўсталыя з руін».
**13.10, 21.05 «Мядовы месяц». Мастацкі фільм (12+).**
**14.45, 22.45** «Легенды кіно» (12+).
**15.20** «Будзе свята».
**16.30 «Жанчыны». Мастацкі фільм (12+).**
**20.05** «Сведкі Вялікай Айчыннай».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**23.35** «Елізар'еў». Дак. фільм.

### Беларусь 5

**7.00** Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — МХК «Спартак» (Масква).
**8.55** Баскетбол. Чэмпіянат Беларусі. Мужчыны. «Барысфен» (Магілёў) — «Рубон» (Віцебск).
**10.55** Між іншым.
**11.15** Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Дынама-Мінск».
**13.15** Слэм-данк.
**13.45, 23.05** Змешаныя адзінаборствы.
**16.00** Більярдавы спорт. Кубак Беларусі.
**18.05** Арэна.
**18.35, 21.40** Спорт-цэнтр.
**18.45** Авертайм: КХЛ.
**19.05** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Амур» (Хабараўск). У перапынках — Авертайм: КХЛ.
**21.50** Агляд НХЛ.
**22.35** Фактар сілы.

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.10** Тэлебарометр.
**10.05, 21.15 Меладрама «Атэльe шчасця» (16+).**
**11.05, 19.15 Серыял «Дзікі» (16+).**
**13.00** «На нажах» (16+).
**14.00** Суд вырашыць (16+).
**15.10** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.15** «ПІН_КОД» (12+).
**16.15 Серыял «Вайна сем'яў» (16+).**
**17.10** «Бітва шэфаў» (16+).
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**22.25** Як дома (16+).
**23.10 Серыял «Дах свету» (16+).**

## Пятніца, 31 кастрычніка

### Беларусь 1

**6.00, 7.15, 8.20** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**8.15** Зона X (16+).
**9.15** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**10.10 Серыял «След» (16+).**
**12.25, 0.35** «Скажынемаўчы».
**13.25, 15.15 Меладрама «Тэст на вернасць» (16+).**
**18.00** «100 пытанняў даросламу» (12+).
**19.10** Спецыяльны рэпартаж Першага інфармацыйнага (12+).
**19.20** Зона X. Вынікі тыдня (16+).
**19.55, 20.45** «Фактар. BY».
**20.00** Панарама.
**23.15** Клуб рэдактараў (16+).

### АНТ

**6.00, 7.10, 8.10, 9.10** «Наша раніца».
**7.00, 8.00, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** Нашы навіны.
**10.00** «Жыць здарова!» (16+)
**11.15** «Модны прыгавор» (6+).
**12.15, 13.15, 23.20 Фільм «Нязломная» (12+).**
**15.00** «Давай пажэнімся!» (16+)
**16.20** «Мужчынскае/Жаночае» (16+).
**17.30** «Трывожная кнопка» (16+).
**18.20** «Народны ДАСТ» (16+).
**18.55** «Поле цудаў» (16+).
**20.10** Вячэрнія навіны.
**20.30** Нашы навіны. Пятніца.
**21.25 Фільм «Перавярні старонку» (16+).**
**1.30** Час.

### СТБ

**6.00, 6.45, 7.45, 8.45** «Інфармацыйная раніца».
**6.30, 7.30, 8.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**9.00** «Жыццё зорак» (16+).
**10.45** «Дарагія таварышы» (16+).
**12.45** «Маскоўская павуціна» (16+).
**13.50, 0.40 «Марскія д'яблы. Смерч-2». Серыял (16+).**
**16.50** «Міншчына».
**17.00** «Рашэнне ёсць! Дэпутацкі адказ».
**17.30** «Назад у СССР» (16+).
**18.45** «У пошуках ісціны. «Вясельны перапалох».
**20.15** «Дзермант. Сэнсы».
**20.25, 23.05** «СТБ-спорт».
**20.35** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.45 «Шэф». Серыял (16+).**
**23.20** «Следства вядзе КДБ».

### МІР

**5.00, 6.15, 10.10 Тэлесерыял «Экспрапрыятар» (16+).**
**6.00, 10.00, 13.00, 16.00** Навіны.
**12.30** «Зразумець. Прабачыць» (16+).
**13.15** « Міравое пагадненне» (16+).
**14.10** «Справы судовыя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05** «Справы судовыя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15** «Падману. Не» (16+).
**16.35, 18.20** «Справы судовыя. Яблык разладу» (16+).
**18.00** Разам кожны дзень.
**18.45** «Справы судовыя. Грошы вярніце!» (16+)
**19.40 Маст.фільм «Кахаць па-руску» (16+).**
**21.30 Маст.фільм «Кахаць па-руску 2» (16+).**
**23.25 Маст.фільм «Кахаць па-руску 3. Губернатар» (16+).**
**1.05** «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
**3.55 Мастацкі фільм «Вяселле» (16+).**

### Першы Інфармацыйны

**5.00, 5.30, 6.05, 6.30, 7.40, 8.35, 8.45, 9.45, 10.30, 11.30, 11.55, 12.30, 13.35, 14.30, 15.30, 16.30, 17.35, 18.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 23.35, 0.05, 1.00, 2.00, 3.00, 4.00** Навіны. Дайджэст.
**5.10, 5.40, 6.15** Навіны эканомікі (12+).
**5.20, 9.35, 12.50, 20.20, 0.15** Баявое дзяжурства (12+).
**5.50, 7.50, 9.50, 13.50** Тэхнагайд (12+).
**6.00, 0.00** Гімн.
**6.40, 10.40, 12.35, 14.10, 14.40, 15.35, 16.40, 17.40, 18.10, 20.40, 23.40, 2.15, 3.30, 4.15** Спецыяльны рэпартаж (12+).
**7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**7.35, 13.40, 23.55** Аўтарскі погляд (12+).
**8.40** Прэс-агляд (12+).
**10.10, 13.20, 15.15, 16.10, 18.40, 20.05, 22.20, 23.20, 1.15, 3.15** Актуальнае інтэрв'ю (12+).
**11.10, 11.35, 21.20, 0.20, 4.30** Тэлефільм (16+).
**14.00, 17.20** Навіны. Мінск.
**14.35, 16.35, 18.35, 01.10, 03.10** Дзень спорту.
**19.30, 22.35** Зразумелая палітыка (12+).
**21.15, 22.15, 23.15** Тэма дня.
**22.50, 0.50, 3.45** Навіны-сеткі (12+).
**1.30, 2.30** Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

**6.00, 9.00, 10.00, 11.30, 14.30, 17.30, 21.00, 23.00** Беларусь. Навіны.
**6.05** «Новая раніца».
**9.05, 10.05 Серыял «Таямніцы следства» (16+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.40** «Пра самае галоўнае» (12+).
**12.50** «Кропкі над і» (16+).
**14.40** «60 хвілін».
**16.40** «Крокі незалежнасці».
**17.40 Фільм «Той мужчына, тая жанчына» (12+).**
**18.45** «Прамы эфір». (16+).
**21.30** «Шум пятніцы».
**22.35, 23.15 Серыял «Кругі на вадзе» (16+).**
**0.50** «Гісторыі вялікай краіны».

### НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.05, 8.25, 13.20, 22.55, 23.45** Сёння. Галоўнае.
**6.10** «Здарова здаровым быць!» (6+)
**7.20** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**8.35** «НЗ.by».
**9.00, 10.35 Баявік «Марскія д'яблы» (16+).**
**12.30** Таямніцы следства (12+).
**13.25** «Надзвычайнае здарэнне».
**13.55** НЗ.BY: аператыўна (16+).
**14.00** «ДНК» (16+).
**15.00** «Чакай мяне» (12+).
**16.40, 20.00** Галоўнае. Сёння. Беларусь.
**16.50 Серыял «Пёс» (16+).**
**20.15** «Экспертыза злачынстваў» (16+).
**20.45, 22.20, 23.00 Серыял «Васька» (16+).**
**21.55** «НЗ.by: час вынікаў».
**23.30, 0.00 Серыял «Рэалізацыя» (16+).**

### Беларусь 3

**7.00** «Дабранак».
**7.35, 12.35** «Беларуская кухня».
**8.05, 13.05, 18.15, 20.25** «Навіны культуры».
**8.15 «Не магу сказаць «бывай». Мастацкі фільм (12+).**
**9.45 «Жанчыны». Мастацкі фільм (12+).**
**11.30** «Веды ў кубе».
**12.10** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**13.15 «Ёлкі-палкі!..» Мастацкі фільм (12+).**
**14.45** «Легенды кіно» (12+).
**15.25** «Легенды эстрады».
**16.10** «Сіла веры».
**16.35 «Хто смяецца апошнім». Мастацкі фільм (12+).**
**18.25 «Не магу сказаць «бывай». Мастацкі фільм (12+).**
**20.00** «Паўсталыя з руін».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05** XXXI Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад».
**22.35 «Чорны замак». Мастацкі фільм (12+).**

### Беларусь 5

**7.00, 13.00, 17.35** Змешаныя адзінаборствы.
**10.05** Фіз-ра.
**10.35** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Амур» (Хабараўск).
**12.30** Фактар сілы.
**15.05** Гісторыя адной перамогі.
**15.25** Авертайм.
**15.55** Гандбол. Міжнародны турнір. Мужчыны. Расія — Ірак.
**18.25** Гандбол. Міжнародны турнір. Мужчыны. Беларусь — зборная беларускіх клубаў.
**20.10** Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Металург» (Жлобін) — «Славуціч» (Смаленск). У перапынках — «Спорт-цэнтр».
**22.30** На спорце.
**22.50** Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Хетафэ» — «Жырона».

### Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 16.10** Тэлебарометр.
**10.05 Меладрама «Атэльe шчасця» (16+).**
**11.05 Серыял «Дзікі» (16+).**
**13.00** «На нажах» (16+).
**14.00** Суд вырашыць (16+).
**15.10** Нічога сабе ньюз (12+).
**15.15** «ПІН_КОД». (12+).
**16.15 Серыял «Вайна сем'яў» (16+).**
**17.15** «100 месцаў, дзе паесці» (16+).
**18.10 Фільм «Манюня. Прыгоды ў Маскве» (6+).**
**19.45** «Уральскія Пельмені» (16+).
**21.10** Спортлато 5 з 36, КЕНА.
**21.15** «Вялікія дзяўчынкі» (16+).
**22.50** Як дома (16+).
**23.20** «Мама дарагая» (16+).

## Субота, 1 лістапада

### Беларусь 1

6.05 Меладрама «Тэст на вернасць» (16+).
7.55 Існасць.
8.20 Слова Мітрапаліта Веніяміна на Дзмітрыеўскую бацькоўскую суботу.
8.30 Сэнс жыцця (12+).
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.20 «Добрай раніцы, Беларусь!» (12+)
10.05 Здароўе (12+).
10.55 Маршрут пабудаваны (12+).
11.30 Дача (12+).
12.20 Меладрама «Выхаванне і выгул сабак і мужчын» (12+).
14.30 Зона Х. Вынікі тыдня (16+).
15.20 Краіна.
15.50 Адзін дзень (12+).
16.20 Таямніцы следства (12+).
16.50, 19.10 Меладрама «Вер свайму мужу» (16+).
20.55 «Фактар. BY».
21.00 Панарама.
21.50 «Добры вечар!» (12+)
23.20 Меладрама «Лабірынт ілюзій» (16+).

### АНТ

7.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
7.10 «Маркаў. Нічога асабістага» (16+).
8.00, 9.10 «Наша раніца ў суботу».
10.00 «Трывожная кнопка» (16+).
10.30 «Белыя Росы» (12+).
11.05 Фільм «Капітанша» (16+).
15.30, 16.20 Фільм «Адваротны бок кахання» (16+).
20.00 «Як паглядзець».
21.00 «Метэагід».
21.25 «Зорны шлях» (12+).
0.00 Фільм «Падманнае шчасце» (12+).

### СТБ

6.20, 8.50 «Камея з Ватыкана». Серыял (16+).
8.00 «Цэнтральны рэгіён».
8.30 «Анфас».
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Навіны «24 гадзіны».
10.45 «Мінск і мінчане».
11.15 «У пошуках ісціны. «Разумны ген».
12.00, 13.45 «Куба. Асабістая справа». Серыял (16+).
15.55, 16.50, 21.00 «Чужая асоба». Серыял (16+).
20.20 «Палітыка без гальштукаў і купюр».
20.35 «Слова і справа».
20.50 «СТБ-спорт».
0.15 «Дзевяностыя» (16+).

### МІР

5.00, 7.55, 4.35 Мультфільмы (12+).
5.25 «Усё як у людзей» (6+).
5.50 Маст. фільм «Формула кахання» (16+).
7.20 «Гістарычны дэтэктыў з Мікалаем Валуевым» (16+).
8.15 «Гульня ў кіно. Мультфільмы» (16+).
9.00, 10.10 Маст. фільм «Жывіце ў радасці» (16+).
10.00, 13.00, 18.00 Навіны.
10.45 Маст. фільм «Самая абаяльная і прывабная» (16+).
12.35, 13.15 Маст. фільм «Кахаць па-руску» (16+).
14.45 Маст.фільм «Кахаць па-руску-2» (16+).
16.35, 18.15 Маст. фільм «Кахаць па-руску-3. Губернатар» (16+).
18.55 Тэлесерыял «Запіскі экспедытара таемнай канцылярыі» (16+).
2.00 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).
2.50 Маст. фільм «Аляксандр Неўскі» (12+).

### Першы інфармацыйны

5.00, 5.35, 6.05, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.35, 9.35, 10.30, 11.30, 11.55, 12.30, 13.25, 14.30, 15.35, 16.30, 16.50, 17.35, 18.30, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 23.30, 1.00, 3.00 Навіны. Дайджэст.
5.10, 9.30, 12.50, 0.15 Баявое дзяжурства.
5.15, 6.40, 8.15, 9.40, 11.35, 12.35, 14.10, 14.40, 15.40, 17.40, 18.40, 20.40, 23.35, 1.10, 2.5.
5.50, 12.00, 16.40 Навіны-сеткі (12+).
6.00, 0.00 Гімн.
6.15, 8.40, 11.15, 15.20, 16.10, 18.10, 20.05, 22.15, 23.15 Актуальнае інтэрв'ю (12+).
7.15, 7.40, 9.20, 10.20 Меркаванне клуба (12+).
08.30, 23.50 Аўтарскі погляд (12+).
9.00, 10.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
10.10, 13.20, 17.20, 0.50, 2.15, 3.50 Тэхнаполіс.
10.35, 13.30, 21.15, 22.35, 0.20, 3.10, 4.30 Тэлефільм (12+).
11.00, 14.00, 17.50, 19.50 Вам тэлеграм (12+).
14.35, 16.35, 18.35, 1.05, 3.05 Дзень спорту.
16.00, 18.00, 0.05, 2.00, 4.00 Вынікі тыдня.
19.10 Вакол планеты (12+).
22.30 Прагноз надвор'я з вядучым.
1.30, 2.30 Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

7.00 «Новая раніца».
9.30 «Гісторыі вялікай краіны» (12+).
10.25 «Дакрананне да святла».
10.40 «Пуцёўка.BY».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 21.00 Беларусь. Навіны.
11.40 «Нашы. Ваенкары» (12+).
12.10 «Доктар Мяснікоў» (12+).
13.05 «Вялікія перамены».
14.50 «Гумарына-2025» (16+).
17.50 «Прывітанне, Андрэй!» (12+)
19.45 «Плюс-мінус».
21.30 Фільм «Тысяча руж» (16+).
0.45 Фільм «Маска — Лапушкі» (12+).

### НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10, 7.10 Сёння. Галоўнае.
6.15 Смачна есці (12+).
7.25 Беларусы (6+).
8.00, 10.00, 16.00, 19.00 Сёння.
8.20 «НЗ.by: час вынікаў».
8.50 Адзін дзень (12+).
9.25 «Меню ад шэфа» (6+).
10.20 Знак якасці (6+).
10.45 «Галоўная дарога» (16+).
11.25 «Жывая ежа з Сяргеем Малазёмавым» (12+).
12.20 Кватэрнае пытанне (0+).
13.30 «Паедзем, паядзім!» (12+)
14.35 Драма «Справа для сапраўдных мужчын» (12+).
16.20 «Следства вялі...» (16+)
17.10 «Сакрэт на мільён» (16+).
20.00 «ВІА Суперстар!» (16+)
23.15 Фільм «Двое» (16+).

### Беларусь 3

7.05 «Сіла веры».
7.35 «Малы і Карлсан». Мультфільм (0+).
7.50 «Карлсан вярнуўся». Мультфільм (0+).
8.10 «Навіны культуры».
8.25 «Ёлкі-палкі!..» Мастацкі фільм (12+).
9.50 «Беларуская кухня».
10.20 «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
10.45 «Мой Купалаўскі».
11.00 «То! Лато».
11.25 «Дзяржаўная граніца». Фільм першы «Мы наш, мы новы...» (12+)
13.50 «Навука побач» (6+).
14.15 «Навіны культуры».
14.25 «Веды ў кубе».
15.05 «Прыступіць да ліквідацыі». Мастацкі фільм (12+).
17.25 Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі ім. М. Я. Фінберга.
19.05 «Вусаты нянь». Мастацкі фільм (6+).
20.25 «Суразмоўцы».
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Шыфр-2». Фільм (16+).

### Беларусь 5

7.00 Гандбол. Міжнародны турнір. Мужчыны. Беларусь -зборная беларускіх клубаў.
8.40 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Хетафэ» — «Жырона».
10.40 Фіз-ра.
11.10 Агляд НХЛ.
11.55 Гандбол. Міжнародны турнір. Мужчыны. Расія — зборная беларускіх клубаў.
13.40 Вялікі спорт.
14.25 Гандбол. Міжнародны турнір. Мужчыны. Беларусь — Ірак. (У перапынку — «Дай пяць!»).
16.10 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Славія» (Мазыр) — «Нафтан» (Наваполацк).
18.10 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. МЛ (Віцебск) — «Іслач» (Мінскі р-н). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
20.10 Футбол. Чэмпіянат Расіі. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург) — «Лакаматыў» (Масква). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
22.20 Як гэта было.
22.50 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Рэал» (Мадрыд) — «Валенсія».

### Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Найлепшае за тыдзень» (12+).
9.00, 17.35 Тэлебарометр.
9.05 «На нажах» (16+).
11.05 Смачна есці (12+).
11.55 Усё ў парадку (12+).
12.25 Я з вёскі (12+).
13.05 Меладрама «Час ажаніцца» (16+).
17.00 Як дома (16+).
17.40 «100 месцаў, дзе паесці» (16+).
18.35 «10 самых...» (16+)
19.10 «Востраў скарбаў. Знакі лёсу» (16+).
21.10 Спортлато 6 з 49, КЕНА.
21.15 Камедыя «Лаўсторы» (16+).
22.55 «Вялікія дзяўчынкі» (16+).

## Нядзеля, 2 лістапада

### Беларусь 1

5.35 Меладрама «Тэст на вернасць» (16+).
7.25 Клуб рэдактараў (16+).
8.50 Слова Архібіскупа Іосіфа Станеўскага на Дзень Памінання ўсіх памерлых.
9.00, 12.00, 15.00, 19.00 Навіны.
9.20 «Арсенал» (12+).
9.55 Меладрама «Кім мы не станем» (16+).
12.20 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.45 «Героі» (6+).
13.45 «100 пытанняў дарослалму» (12+).
14.45 Спецыяльны рэпартаж Першага інфармацыйнага (12+).
15.25 Вакол планеты.
16.05 Маршрут пабудаваны (12+).
16.35, 19.10 Меладрама «Хрустальнае шчасце» (12+).
20.40 Навіны надвор'я.
21.00 Галоўны эфір.
22.35 Меладрама «Лабірынт ілюзій» (16+).

### АНТ

7.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
7.10 Фільм «Перавярні старонку» (16+).
8.35 «Народны ДАСТ» (16+).
9.10 «Метэагід».
9.35 «Здароўе» (16+).
10.40 «Народны повар» (12+).
12.00 Фільм «Па розных берагах» (12+).
16.20 Фільм «Падманнае шчасце» (12+).
20.00 Контуры.
21.15 Фільм «Адваротны бок кахання» (16+).
0.55 «Што? Дзе? Калі?» (16+)
2.05 Фільм «Небяспечная блізкасць» (18+).

### СТБ

6.50 «Зямное прыцягненне». Серыял (16+).
10.00 «Вялікі горад».
10.30, 13.30, 16.30 Навіны «24 гадзіны».
10.45 «Следства вядзе КДБ» (16+).
12.00, 13.45, 17.00, 21.30 «Шэф». Серыял (16+).
16.45 «Сенат».
19.30 «Тыдзень».
20.30 «Суровы погляд».
21.15 «Спорт-таймер».
23.10 «Дзевяностыя» (16+).
0.30 «Сапраўдны дэтэктыў» (16+).

### МІР

5.00 Мультфільмы (12+).
7.40 «ФазендаЛайф» (6+).
8.15 «Дыктар робіць» (16+).
8.50, 10.10 Маст. фільм «Фронт без флангаў» (16+).
10.00, 13.00 Навіны.
12.30, 13.15 Маст. фільм «Фронт за лініяй фронту» (16+).
16.30, 19.00 Маст. фільм «Фронт у тыле ворага» (16+).
18.00, 0.00 «Разам».
20.40 Маст. фільм «Выпадак у квадраце 36-80» (16+).
22.10 Маст. фільм «Адзінкавае плаванне». Баявік (16+).
1.00 «Падману. Не» (16+).
1.15 Тэлесерыял «Адвакат Ардашаў. Забойства на водах» (16+).
4.15 «Наша кіно. Гісторыя вялікай любові» (16+).

### Першы інфармацыйны

5.00, 5.30, 9.35, 10.30, 11.30, 12.30, 13.25, 14.30, 15.35, 16.30, 17.30, 18.30, 19.45, 20.00, 20.30, 21.00, 22.00, 23.00, 23.30, 1.00, 3.00 Навіны. Дайджэст.
5.05, 9.30, 12.50, 18.50, 22.50, 0.25 Баявое дзяжурства (12+).
5.15, 6.40, 9.40, 10.15, 12.35, 14.15, 14.40, 15.40, 16.40, 17.35, 18.35, 20.40, 23.35 Спецыяльны рэпартаж (12+)
5.40, 7.45, 11.35, 13.40, 15.20, 18.15, 20.05, 22.15, 23.15 Актуальнае інтэрв'ю (12+).
6.00, 0.00 Гімн.
6.05, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00 Вынікі тыдня.
6.20, 7.20, 9.20, 13.35, 16.20 Сусветная навука (12+).
7.15, 11.25, 17.50, 19.50, 23.50, 2.25 Аўтарскі погляд (12+).
8.15 Вакол планеты (12+).
9.00, 10.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00 Навіны.
10.35, 19.15, 21.15, 22.30, 3.10, 4.25 Тэлефільм (12+).
11.00, 16.00, 0.30 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
11.50 Вам тэлеграм (12+).
13.20, 17.20, 19.10, 0.50, 3.50 Громаў LIVE (12+).
14.00, 18.00, 1.10 Твой горад (12+).
14.35, 16.35, 1.05, 3.05 Дзень спорту.
0.05, 2.00, 4.00 Галоўны эфір (12+).
1.30, 2.30 Дак. фільм (12+).

### РТР—Беларусь

6.55 Фільм «Тысяча руж» (16+).
10.15 «Рэцэпт сапраўднага беларуса».
11.00, 14.00, 17.00 Весткі.
11.35 «Ёсць дзяўчынка адна».
12.45 «Нашы. Ваенкары» (12+).
13.15 «У пошуках ісціны».
15.00 «Петрасян-шоу» (16+).
17.50 «Песні ад усёй душы» (12+).
20.00 Весткі тыдня.
21.00 «Акцэнты».
22.00 «Меркаванні».
22.55 Масква. Крэмль. Пуцін.
23.25 «Нядзельны вечар з Уладзімірам Салаўёвым» (12+).

### НТБ—Беларусь

6.05 «Астрапрагноз».
6.10 Сэнс жыцця (12+).
6.50 Майстар-клас: як гэта зроблена? (6+)
7.25 «Дача» (12+).
8.00, 10.00, 16.00 Сёння.
8.20 «Навука побач» (6+).
8.50 «Маршрут пабудаваны» (12+).
9.25 Ежа хоць куды (6+).
10.20 «Справа жыцця» (6+).
10.45 «Кватэрнае пытанне.by» (12+).
11.20 «Першая перадача» (16+).
11.50 «Цуд тэхнікі» (12+).
12.40 «Дачны адказ» (0+).
13.45 «НашСпажыўНагляд» (16+).
14.40, 16.20 Драма «Час вярнуцца» (12+).
17.05 «Следства вялі...» (16+)
18.00 «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
19.00 «Вынікі тыдня з Уладзімірам Чарнышовым».
20.20 «Ты супер!» (6+)
23.10 «Зоркі сышліся» (16+).

### Беларусь 3

7.15 «Пёс у ботах». Мультфільм (6+).
7.35 «Храбры заяц». Мультфільм (0+).
7.55 «Веды ў кубе».
8.35 «Вусаты нянь». Мастацкі фільм (6+).
9.50 «Наперад у мінулае».
10.30 «Беларуская кухня».
10.55 «Нацыянальны хіт-парад».
11.50, 20.00 «Культурны тыдзень».
12.30 «Шыфр-2». Мастацкі фільм (16+).
16.15 «Легенды эстрады».
17.00 «Суперлато».
17.35 «Прыступіць да ліквідацыі». Мастацкі фільм (12+).
20.40 «Калыханка» (0+).
21.05 «Дзяржаўная граніца». Фільм першы «Мы наш, мы новы...» (12+)
23.25 «Ціхая гавань».

### Беларусь 5

7.00 Змешаныя адзінаборствы.
9.20 Фіз-ра.
9.50 Хакей. КХЛ. «Амур» (Хабараўск) — «Адмірал» (Уладзівасток).
12.25 Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «ВітЭн» (Орша) — «Сталіца» (Мінск).
14.25 Гандбол. Міжнародны турнір. Мужчыны. Беларусь — Расія.
15.55 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — ФК «Слуцк». У перапынку — «Спорт-цэнтр».
17.55 Тэніс. WTA.
19.30 Футбол. Чэмпіянат Расіі. ФК «Краснадар» — «Спартак» (Масква). У перапынку — «Спорт-цэнтр».
21.30 Вынікі тыдня.
22.15 Футбол. Чэмпіянат Беларусі. Агляд.
22.55 Футбол. Чэмпіянат Іспаніі. «Бецiс» — «Мальёрка».

### Беларусь 2

6.00 «Уключайся. Найлепшае за тыдзень» (12+).
9.00, 11.50, 16.35 Тэлебарометр.
9.05 «На нажах» (16+).
11.05 Прачніся і спявай! (12+)
12.25 «Мая цудоўная сямейка» (6+).
13.45 «Рогаў у горадзе» (16+).
14.40 «Востраў скарбаў. Знакі лёсу» (16+).
16.40 Фільм «Манюня. Прыгоды ў Маскве» 6+).
18.10 «Уральскія пельмені» (16+).
19.35 Камедыя «Лаўсторы» (16+).
21.10 Спортлато 5 з 36, КЕНА.
21.15 Сямейныя гісторыі (16+).
21.45 Серыял «Вайна сем'яў» (16+).
23.35 «Мама дарагая» (16+).

**Паважаныя работнікі і ветэраны КУП «Віцебскаблдарбуд»!**

*Прыміце шчырыя віншаванні з прафесійным святам —*

**ДНЁМ АЎТАМАБІЛІСТА І ДАРОЖНІКА!**

*Значэнне мясцовых аўтадарог для эканомікі і сацыяльнай сферы нашай вобласці складана пераацаніць. Без вашай надзейнай працы немагчыма функцыянаванне ўсіх галін жыцця Віцебшчыны. Вы падтрымліваеце працоўны рытм прадпрыемстваў і арганізацый, і гэта вынік зладжанай работы ўсяго калектыву.*

*Жадаю вам і вашым сем'ям мірнага неба над галавою, узаемаразумення і ўзаемнай павагі, моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту!*

**З павагай, генеральны дырэктар КУП «Віцебскаблдарбуд» Уладзімір МАТВЕЕЎ.**



Калектыў упраўлення развіцця, утрымання аўтамабільных дарог і бяспекі дарожнага руху. Злева направа: вядучыя інжынеры Надзея САКАЛОВА, Святлана АКУЛІЧ, Алена ПАЛЯВАЯ, начальнік службы якасці Алена ПЕТРУШЭНКА, начальнік аддзела Таццяна ГРЫНЧЫК, начальнік упраўлення Надзея БАЙКОВА, інжынеры Андрэй ЯРОХ і Кацярына КАДУШКЕВІЧ, вядучы інжынер Марына САЛАЎЁВА, начальнік аддзела ўтрымання аўтамабільных дарог Таццяна АЎСЯНІКАВА, вядучы інжынер Наталля ЛАДУЦЬКА і інжынер Іван ІВАШКОЎ.



КОММУНАЛЬНОЕ УНИТАРНОЕ ПРЕДПРИЯТИЕ «ВИТЕБСКОБЛДОРСТРОЙ»

# МЯСЦОВЫЯ ДАРОГІ ПЕРШАСТУПЕННАЙ ЗНАЧНАСЦІ

Працягласць мясцовых аўтамабільных дарог Віцебскай вобласці, якія абслугоўвае КУП «Віцебскаблдарбуд», складае больш за 15 тысяч кіламетраў.
Гэта другая ў краіне пасля Міншчыны па працягласці сетка дарог мясцовага значэння. Менавіта яны звязваюць невялікія і больш буйныя населеныя пункты, прызначаны для руху да вытворчых аб'ектаў, ажыццяўлення дзейнасці сельскагаспадарчых і іншых прадпрыемстваў.

## ФІЛІЯЛЫ, БЛІЗКІЯ ДА РЭГІЁНАЎ

Каб падтрымліваць дарогі ў належным стане, калектыў «Віцебскаблдарбуда» працуе ў рэжыме 24/7, інакш кажучы, штодня і кругласутачна. У кожным райцэнтры і Віцебску прадпрыемства мае свае структурныя падраздзяленні — дарожныя рамонтна-будаўнічыя ўпраўленні з паркамі спецыяльных машын і механізмаў, аўтатранспарту, кар'ерамі, асфальтабетоннымі заводамі. Сваю значную ролю выконваюць філіялы УВТК і «Віцебскдарпраект». Акрамя таго, у склад прадпрыемства ўваходзіць сельскагаспадарчы філіял «Кляўцы», што ў Лёзненскім раёне.

Галоўныя прыярытэтамі КУП «Віцебскаблдарбуд» з'яўляюцца паляпшэнне тэхнічнага стану сеткі мясцовых аўтадарог агульнага карыстання, іх развіццё, а таксама выкананне мэтавых паказчыкаў Дзяржаўнай праграмы «Дарогі Беларусі» на 2021 — 2025 гады.

## МАСТЫ — ЧАСТКА ВЯЛІКАЙ ГАСПАДАРКІ

На фінансаванне дарожнай гаспадаркі толькі на гэты год было выдзелена амаль 186 млн рублёў, большая частка, больш за 136 млн рублёў, — на бягучы рамонт, звыш 44 млн рублёў — на ўтрыманне мясцовых аўтадарог, амаль 5 млн рублёў — на рэканструкцыю аб'ектаў. Сёлета за першыя восем месяцаў уласнымі сіламі філіялаў выканана работ на суму каля 154 млн рублёў.

— За гэты перыяд уведзены ў эксплуатацыю такі значны аб'ект, як мост на дарозе Обаль — Полацк у Шумілінскім раёне. Запланаваны да ўводу яшчэ тры маставыя збудаванні: на дарозе Ушачы — Бабынічы ў Полацкім раёне, Юнькі — Варапаева-Мярэцкія ў Пастаўскім раёне, Віцебск — Сіроціна ў Шумілінскім раёне, — пералічвае **генеральны дырэктар КУП «Віцебскаблдарбуд» Уладзімір МАТВЕЕЎ.** — У планах — бягучы рамонт каля 600 км мясцовых дарог, прадугледжаны перавод 193 км такіх дарог з гравійным пакрыццём у асфальтабетоннае.

Асаблівую ўвагу прадпрыемства ўдзяляе рамонту ўчасткаў дарог, што пралягаюць ад раённых цэнтраў да аграгарадкоў з уладкаванням удасканаленага дарожнага пакрыцця. Так, сёлета змены да лепшага датычыліся Браслаўскага, Віцебскага, Глыбоцкага, Гарадоцкага, Дубровенскага, Сенненскага, Талачынскага, Шаркаўшчынскага раёнаў.

## ПА ПРЫНЦЫПАХ ПАРАДКУ

Яшчэ адна з важных спраў прадпрыемства — добраўпарадкаванне палос адводу і зон адпачынку, якое асабліва актуальнае ў тэматычны год. Пагадзіцеся, у дарозе прыемна назіраць за чыстымі ўзбочынамі ці супыніцца размяць ногі на пляцоўках, дзе ёсць лавачкі, альтанкі, кантэйнеры для смецця. Толькі сёлета віцебскія дарожнікі азелянілі больш за 20 тэрыторый, устанавілі звыш 40 малых архітэктурных формаў. Пастаянна абнаўляюць дарожныя знакі, абкошваюць узбочыны, выдаляюць аварыйныя дрэвы, залішнія хмызнякі і інвазійныя расліны, прафілююць гравійныя і грунтавыя дарогі, фарбуюць інжынерныя ўладкаванні, выконваюць ямачны рамонт. Гэта работа вядзецца комплексна.

Да таго ж, філіялы выконваюць заказы суб'ектаў гаспадарання. Так, Пастаўскае ДРБУ № 132 працавала на рэканструкцыі малочнатаварных фермаў у сваім раёне, а Чашніцкае № 183 прыняло актыўны ўдзел у падрыхтоўцы да абласных «Дажынак»: выканала будаўніча-мантажныя работы на 19 аб'ектах вулічна-дарожнай сеткі і сацыяльных устаноў райцэнтра.



Аўтамабільная дарога ў Верхнядзвінскім раёне.




Дарога Паставы — Мальдзевічы пасля рамонту.

## СПРАВА ЧАЛАВЕЧЫХ РУК

Дарожная гаспадарка трымаецца на добрасумленных, працавітых работніках.

— Выпадковых людзей у нас няма, калектыў складаецца з адукаваных, высокакваліфікаваных кадраў, якія любяць сваю прафесію, — адзначае Уладзімір Матвееў. — Вопыт перадаецца ад старэйшых пакаленняў да маладзейшых. Мы цэнім прафесійныя якасці супрацоўнікаў, іх адданасць дарожнай справе.

Менавіта дзякуючы іх працы, дысцыплінаванасці, адказным адносінам да даручаных участкаў сёння КУП «Віцебскаблдарбуд» можна ахарактарызаваць як прадпрыемства з наладжанай сістэмай арганізацыі і якаснага выканання работ ва ўстаноўленыя тэрміны, якое мае надзейную рабочую сілу і эфектыўна ўзаемадзейнічае з уладай.

Сёлета высокай узнагародай — нагрудным знакам «Ганаровы дарожнік Беларусі» — ушанаваны 10 работнікаў прадпрыемства, 13 — ганаровай граматай Міністэрства транспарту і камунікацый. Ганаровае званне «Ветэран працы КУП «Віцебскаблдарбуд» прысвоена 25 работнікам, галіновы стаж якіх перавышае 20 гадоў.

## З ЗАДЗЕЛАМ НА ЗАЎТРА

На бягучы момант прадпрыемства абрала курс на тэхнічнае пераўзбраенне, накіраванае на аднаўленне грузавога аўтатранспарту, машын і механізмаў для ажыццяўлення работ па рамонце і ўтрыманні мясцовых аўтадарог. Сярод іх — пагрузчыкі, трактары, аўтагрэйдары, абсталяванне для зімовага і летняга ўтрымання дарог. Так, толькі сёлета тэхнічны парк пабагацее на 90 адзінак машын агульным коштам звыш 30 млн рублёў.

Тэхнічная моц дазваляе ўпэўнена глядзець у заўтра і адчуваць вагу ўжо выкананых сёння работ: рэнтабельнасць продажаў тавараў, работ і паслуг склалася на ўзроўні 7,4 %, прыбытак ад іх рэалізацыі — 12,4 млн рублёў, чысты прыбытак прадпрыемства склаў 6,4 млн рублёў.

— Другі год запар мы атрымліваем вельмі годнае фінансаванне, — задаволены Уладзімір Матвееў. — У параўнанні з 2023 годам у 2024-м яно павялічылася ў 1,8 раза. Такога ж узроўню чакаем па выніках і сёлета. Гэта дазваляе будаваць смелыя планы. Напрыклад, у наступным годзе маем намер заасфальтаваць усе пад'езды да аграгарадкоў, каб было зручна і прыгожа.

**Святлана ЯКАЎЛЕВА, Алена ДАЎЖАНОК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД і з архіва прадпрыемства.**



Калектыў філіяла «Віцебскдарпраект». Першы рад злева направа: начальнік сектара бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці Жанна БАБІЧ, начальнік групы праектавання штучных збудаванняў Тамара ЖУРАЎСКАЯ, інжынер-праекціроўшчык Рэгіна МОЦАР.
Другі рад злева направа: вадзіцель аўтамабіля Анатоль ДЗЯМІДКА, начальнік праектнай групы Жанна ШЛАГАНАВА, вядучы інжынер-праекціроўшчык Марыя СІЛІЧ, інжынер-праекціроўшчык Наталля ШЧАКА, вядучы інжынер па праектна-каштарыснай рабоце Людміла ГУШЧА, інжынеры-праекціроўшчыкі Павел МУТАР, Наталля КЕЧА і Аляксандр НЕВЯРДАСАЎ, вядучы эканаміст Таццяна ВАРАНЬКО, вядучы інжынер па праектна-каштарыснай рабоце Любоў ЛАШКЕВІЧ, інжынер па падрыхтоўцы кадраў Вольга ТЫННАЯ, інжынер-праекціроўшчык Вячаслаў БАРЫСАЎ.

УНП 300003210

ГІСТОРЫЯ ГАЗЕТЫ — ГІСТОРЫЯ КРАІНЫ

# «ПАМЯТНЫ ДЗЕНЬ ДЛЯ МІРАЛЮБІВЫХ НАРОДАЎ»

## 24 кастрычніка 1945 года ўступіў у сілу Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Што з гэтай нагоды 80 гадоў таму пісала «Звязда»

**За 80 гадоў свайго існавання Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, створаная адразу пасля самай крывавай у гісторыі чалавецтва вайны, прайшла розныя этапы. Сёння яна ўжо не з'яўляецца той самай аўтарытэтнай пляцоўкай, дзе знаходзілі вырашэнне глабальныя найважнейшыя пытанні, дзе слухалі і чулі ўсіх. Аднак гэта пляцоўка, хоць у нейкім сэнсе і фармальна, існуе. І Рэспубліка Беларусь (пераемніца БССР) — адна з яе заснавальнікаў. Разам з прадстаўніком СССР (беларусам Андрэем Грамыкам) Статут ААН падпісалі асобна прадстаўнікі савецкіх рэспублік, якія найбольш пацярпелі ў вайну, — БССР і УССР.**

Як гэта адбывалася 80 гадоў таму — не цягам аднаго дня, а некалькіх месяцаў, бо падпісваўся Статут у канцы чэрвеня 1945-га, можна прасачыць, пагартаўшы старонкі тагачаснай «Звязды», якая публікавала як матэрыялы з Сан-Францыска, так і поўны тэкст Статута ААН на беларускай мове.

«У зал уваходзіць беларуская дэлегацыя, — паведамляў Міхась Лынькоў (вядомы пісьменнік, які быў у складзе дэлегацыі, а таксама ў ролі карэспандэнта на месцы



Фотакопія подпісаў дэлегатаў БССР пад Статутам ААН.



Выступленне Міністра замежных спраў БССР К. В. Кісялёва на пасяджэнні І сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Лондан, 1946 г.

падзей). — Трашчаць шматлікія апараты фота- і кінарэпарцёраў, успыхваюць сотні фотаўспышак. Час — без чвэрці адна гадзіна дня. Глава дэлегацыі таварыш Кісялёў падпісвае статут і пагадненне...» Пасля адабрэння Статута і другіх дакументаў усе дэлегаты і публіка падняліся і апладзіравалі на працягу некалькіх хвілін.

Але з падпісаннем Статута Арганізацыя Аб'яднаных Нацый яшчэ не пачала існаваць. У многіх краінах Статут павінен быў яшчэ адобраны кангрэсам або парламентам. Таму было прадугледжана, што дакумент уступіць у сілу, калі ўрады Кітая, Францыі, Вялікабрытаніі, Савецкага Саюза, Злучаных Штатаў і большасці іншых краін, якія падпісалі Статут, ратыфікуюць яго і дашлюць аб тым паведамленні Дзяржаўнаму дэпартаменту Злучаных Штатаў.

Нарэшце, 24 кастрычніка 1945 года дакумент уступіў у сілу — гэты дзень адзначаецца як Дзень Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. У № 206 за 1945 год у нашай газеце з'явілася нататка: «Сёння ў 1 г. 45 м. па Грынвічу дзяржаўны сакратар ЗША Бірнс падпісаў пратакол, у якім гаворыцца, што Статут Аб'еднаных нацый уступіў у сілу».

У публікацыі змешчаны і пераказ заявы, якую зачытаў дзяржсакратар ЗША на цырымоніі: «Падтрыманне міру залежыць не ад якога-небудзь дакумента, а ад мысляў і пачуццяў людзей. Народы зямнога шара, жадаючыя міру, павінны арганізавацца для таго, каб падтрымліваць гэты мір. Гэты статут прадугледжвае арганізацыю. У цяперашнія дні мы зробім усё магчымае ў супрацоўніцтве з другімі аб'еднанымі нацыямі для таго, каб захаваць мір і садзейнічаць добрабыту ўсіх народаў».

**Яна ВАЛАСАЧ.**

НАДВОР'Е

# ЦЁПЛА, АЛЕ НЕНАДОЎГА

## У суботу месцамі моцныя дажджы



**Так і не дачакаліся мы позняга бабінага лета, калі толькі на захадзе краіны, ды і тое з дажджамі, расказалі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Сёння надвор'е будуць вызначаць атмасферныя франты і цёплая вільготная паветраная маса. Воблачна з праясненнямі, ноччу на большай частцы тэрыторыі, днём пераважна па паўднёва-заходняй палове краіны пройдуць дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер паўднёва-ўсходні ўмераны, удзень парывісты. Тэмпература паветра ноччу складзе 6 — 12 °C, днём — 12—17 °C.

А ўжо ў суботу ўмовы надвор'я будзе фарміраваць актыўная франтальная сістэма, якая ссоўваецца з боку паўднёвага захаду Еўропы, услед за якой днём пачне паступаць больш халодная паветраная маса. Будзе воблачна, часам пройдуць дажджы, месцамі — моцныя. Вецер паўднёва-ўсходні з пераходам на заходні парывісты, месцамі моцны. Тэмпература паветра на працягу сутак складзе ад 5 да 12 °C.

Будзе не зусім камфортна і ў нядзелю. У гэты дзень адаб'ецца ўплыў франтальных раздзелаў, якія ссоўваюцца з тэрыторыі Польшчы. Воблачна з праясненнямі, на большай частцы тэрыторыі чакаюцца дажджы. Вецер паўднёва-заходні, паўднёвы парывісты, удзень месцамі моцны. Тэмпература паветра ўначы ад 1 да 7 °C, днём — 6—12 °C.

**Сяргей КУРКАЧ.**
**Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.**




24 кастрычніка | Даты | Падзеі | Людзі




**1913** год — у Мінску «па найвысокім дазволе губернатара» было адкрыта аддзяленне міжнароднага таварыства фізічнага развіцця «Санітас». Тады ж у горадзе з'явілася першая футбольная каманда.

**1928** год — нарадзіўся Адам Яўгенавіч Супрун, беларускі мовазнаўца, які даследаваў пытанні тэарэтычнай і прыкладной лінгвістыкі, граматыку, лексіку і гісторыю славянскіх моў, методыку выкладання рускай мовы ў нацыянальных школах.




**1945** год — заснаванне ААН, менавіта ў гэты дзень набыў моц устаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. ААН створана 51 краінай, якія былі напоўнены рашучасцю захаваць мір праз развіццё міжнароднага супрацоўніцтва і гарантаванне калектыўнай бяспекі. Сярод заснавальнікаў — Рэспубліка Беларусь (у той час — БССР). На сённяшні дзень членамі ААН з'яўляюцца 192 краіны.

**1950** год — дырэктывай маршала Савецкага Саюза Аляксандра Васілеўскага ў СССР створаны армейскі спецназ. Дакумент прадпісваў сфарміраваць да 1 мая 1951 года 46 рот спецыяльнага прызначэння штатнай колькасцю па 120 чалавек.


ПАВАЖАНЫЯ РАБОТНІКІ ДАРОЖНАЙ ГАЛІНЫ, ШАНОЎНЫЯ ВЕТЭРАНЫ!

Прыміце шчырыя віншаванні з прафесійным святам ад калектыву камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Брэстаблдарбуд». Наша прадпрыемства з больш чым 85-гадовай гісторыяй вядзе праектаванне, будаўніцтва, рамонт дарог, забяспечвае іх утрыманне. Кожны дзень мы, як і нашы калегі па ўсёй краіне, выходзім на працоўную вахту, каб дарога для ўсіх была добрая і камфортная.

Усе мы часта адрасуем пажаданне адно аднаму: «Шчаслівай дарогі!» Сёння асаблівая нагода пажадаць здароўя, шчасця, сямейнага дабрабыту, мірнага неба калегам, ветэранам галіны, а таксама ўсім людзям, якія карыстаюцца нашымі дарогамі!



Ад імя калектыву КУП «Брэстаблдарбуд» генеральны дырэктар Сяргей ПАНЧАНКА.

УНП 200020752

РАБОТА В МИНСКЕ ВАХТОЙ

- КАССИРЫ,
- ПРОДАВЦЫ,
- ВЫКЛАДКА ТОВАРА,
- ПОВАРА,
- ГРУЗЧИКИ,
- ПОСУДОМОЙЩИКИ,
- УБОРЩИЦЫ.

Заработная плата – до 3000 бел. руб. ЧИСТЫМИ!

БЕСПЛАТНОЕ проживание и проезд.

Звоните по телефону +375 44 753 0097

УНП 693388531



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.



Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.



www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12 685. Індэкс 63850. Зак. № 2211.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 кастрычніка 2025 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12